***Канстанцін Трамбіцкі***

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫМ КАЛЕКТЫВЕ

*(на прыкладзе творчасці ансамбля «Баламуты» БДУКМ)*

Развіццё нацыянальнага мастацтва і пашырэнне цікавасці да яго з боку сучаснай студэнцкай моладзі з'яўляюцца неад'емнымі ўмовамі абуджэння нацыянальнай свядомасці, захавання культурнай спадчыны і гістарычнай памяці, увасабленай у дасягненнях многіх пакаленняў беларускага народа. Асаблівае значэнне ў гэтым працэсе мае народна-інструментальнае мастацтва, што ўяўляе сабой складаную, многааспектную з'яву. Яно ўключае і спадчыну старажытнай традыцыйнай аўтэнтычнай культуры, і мастацкія дасягненні самадзейнай творчасці, і ўзоры музычнага прафесійнага мастацтва. Іх ўзаемасувязь значна ўзбагачае музычную культуру інструменталістаў.

Фальклорнае мастацтва, або музычная творчасць фальклорнага кірунку, на працягу ўсяго часу існавання з'ўлялася важным сродкам нацыянальнага, эстэтычнага выхавання і мастацка-творчага развіцця асобы. На жаль, большая частка сучасных інструментальных калектываў краіны кіруюцца ў сваёй дзейнасці сучаснымі тэндэнцыямі, арыентаванымі на забаўляльныя формы класічнага і эстраднага мастацтва, «візуалізацыю», рознажанравасць і полістылістыку. Вучэбны ансамбль «Баламуты» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў сёння застаецца пакуль што адзіным калектывам фальклорнага кірунка на кафедры народна-інструментальнай творчасці.

Ансамбль «Баламуыі» быў створаны ў 1994 годзе пры Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры. Заснавальнікам і першым кіраўнікoм ансамбля была дацэнт кафедры ***Трамбіцкая Валянціна Іванаўна*** (1945 -2007). Шлях ансамбля быў цяжкі і цярністы, але шчаслівы і ганаровы, асабліва калі ісці першым, адкрываючы дарогу іншым. Трэба адзначыць, што і сама кіраўнік - Валянціна Іванаўна - таленавіты і вельмі творчы чалавек, неўтаймаваны і нястрымны да працы, увесь час - у новых задумках, пошуках незвычайнага ў самым звычайным, у нястрымным руху да мэты, дасканаласці. Менавіта, дзякуючы самаадданай і плённай працы, калектыў выбраў адзіную лінію: пошук і адраджэнне на высокім прафесійным узроўні народных мелодый ў іх нязводнай чароўнасці і прыгажосці, непаўторнай адметнасці інструментальных традыцый.

Першыя гады дзейнасці для ансамбля былі часам пошуку свайго творчага аблічча і арыгінальнага рэпертуару. Яго склалі апрацоўкі песенных і танцавальных мелодый, якія былі запісаны ў розных рэгіонах Беларусі, а гаксама лепшыя ўзоры еўрапейскага фальклору - польскія, рускія, украінскія, яўрэйскія, літоўскія, цыганскія, малдаўскія мелоды. На пачатку сваёй дзейнасці гэта быў выключна інструментальны калектыў, аднак з цягам часу склалася і група спевакоў з ліку студэнтаў кафедры народнапесеннай творчасці і саміх музыкантаў. У інструментальны склад калектыву ўвайшлі традыцыйныя беларускія музычныя інструменты, на якіх вучыліся іграць студэнты розных спецыяльнасцей: цымбалы, баяны, скрыпкі, народныя (дудка, жалейка, акарына, дуда) і ўдарна-шумавыя інструменты.

Ужо жо ў 1998 годзе ансамбль стаў лаўрэатам фэстывалю народнага гумару «Аўцюкі» (Калінкавіцкі р-н), у 1998 - уладальнікам Гран-пры (у намінацыі «інструментальнае мастацтва») V Рэспубліканскага фестывалю «Студэнцкая вясна» у Віцебску. Безумоўна, самай яскравай і запамінальнай падзеяй для музыкантаў стала перамога і атрыманне ганаровага звання «лаўрэата» на Ш міжнародным фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» у 1998 годзе ў Паставах. Калектыў вылучаецца сваёй самабытнасцю, віртуозным майстэрствам ігры на музычных інструментах, непаўторнасцю тэмбравай палітрай гучання і дыяпазонам галасоў. Сярод удзельнікаў - таленавітыя і творчыя студэнты, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнга Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі - цяперашні кіраўнік ансамбля КТрамбіцкі (1998) і саліст ансамбля, выканаўца на духавых інструментах Каляда Аляксандр (2000).

За сваі 15 год існавання «Баламуты» сталі лаўрэатамі шматлікіх фестываляў і конкурсаў народнай музыкі. Ансамбль прымаў удзел ў Міжнародных фестывалях у Расіі - «Фестиваль народов Севера» (2001 г., г.Умба Мурманскай вобласці), Усерасійскі конкурс-фестываль рускай народнай творчасці «Русская сказка» (2008 г., Санкт-Пецярбург), Венгрыі (19% г., 2004 г.), Італіі (1999 г., г. Трэвіза), Украіне (фестываль народнай музыкі «В Борхцівському краї' цвітуть вишиванки» (2010 г., Цернопальская вобласць), Славакіі (1999-2008 гг., г.Кошьшэ, г.Бардзіеў, г.Койшаў). Ансамбль прымае ўдзел у святочных мерапрыемствах сталіцы і краіны, у тым ліку «Дажынкі», «Свята горада», творчых праектах універсітэта і кафедры.

Канцэртныя праграмы «Баламутаў» - яскравыя, вясёлыя, напоўненыя жартам і народным гумарам, - заўсёды маюць поспех. Слухачам калектыў успадобіўся за традыцыйнае і адначасова арыгінальные гучанне народных мелодый, нестандартнасць музычнага вырашэння, непаўторны каларыт і атрыманы добры настрой. Ансамбль шмат гастралюе па Беларусі і за яе межамі - у Расіі, Украіне, Францыі, Італіі, Славакіі. Гэтым ён уносіць значны ўнёсак ва ўзмацненне культурных сувязей паміж народамі, папулярызуе беларускае народнае мастацтва па-за межамі краіны. Ансамбль прымаў ўдзел ў тэлефестывалях «Сябрына» (2000) і «Чырвоная кветка» (2001) Нацыянальнага тэлебачання, міжнародным «Дударскім фэсце» (2008, 2009, г.Мінск).

Творчая праца ансамбля вылучаецца наватарскімі пошукамі: традыцыйныя вытокі інструментальнай і спеўнай культуры спалучаюцца з сучаснымі тэндэнцыямі. Удзельнікі калектыва ставяць на мэце папулярызацыю спрадвечных народных музычных традыцый Беларусі сярод сучаснай малодзі, захаванне беларускай нацыянальнай музычнай культуры. Вынікам яго плённай шматгадовай працы з'яўляецца назапашаны цікавы рознажанравы і рознахарактарны рэпертуар, які складаюць народныя танцы ў аўтарскай апрацоўцы В.Трамбіцкай і К.Трамбіцкага, прыпеўкі, беларускія народныя песні і танцы («Дзявочыя вячоркі», «Барыня», «Калядкі», «Вясельны вальс», «Ехаў чумак з Украіны» і інш.). Значнае месца ў рэпертуары займаюць апрацоўкі народных мелодый, зробленыя ў свой час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У.Громам (творы для дуды с ансамблем «Шастак», «Кругавая» і інш.). З калектывам плённа працуе вядомы беларускі музыкант і кампазітар Мікалай Сірата. Яго інструментальная апрацоўка вядомай беларускай песні «Что за месяц» была напісана спецыяльна для «Баламутаў». Весела і з запалам у выкананні ансамбля гучаць «Вясковыя найгрышы» у апрацоўцы А. Ковалёва і «Калядкі» у апрацоўцы В. Трамбіцкай.

Асноўны накірунак творчай дзейнасці ансамбля - засваенне музычнага фальклору беларусаў і іншых славянскіх народаў, а таксама адраджэнне і папулярызацыя ва ўмовах сучаснай сцэнічнай практыцы традыцыйных музычных інструментаў беларусаў - дуды, жалейкі, акарыны, чароткі. У дзейнасці калектыва спалучаюцца як вусныя формы засваення фальклору - ігра на слых, імправізацыя, так і пісьмовыя - ігра па нотах, стварэнне аўтарскіх інструментовак і апрацовак народных мелодый. Беларускі фальклор (танцавальная, спеўная і абрадавая музыка) складае аснову рэпертуара Трэба адзначыць, што большасць з твораў інструментаваны студэнтамі, якія займаюцца ў калектыве. Асобнай ўвагі заслугоўвае і даследчыцкая праца кіраўнікоў і ўдзельнікаў ансамбля. Яны вывучаюць традыцыйную інструментальную культуру, выязджаюць у творчыя экспедыцыі, запісваюць інструментальныя найгрышы ад сталых носьбітаў мясцовай традыцыі, а таксама шырока выкарыстоўваюць занатаваныя аўтэнтычныя мелодыі. Так, напрыклад, беларуская народная песня «Ехаў чумак з Украіны» з рэпертуару ансамбля была знойдзена ў песенным сборніку «Lud Byalaruski» (1958), дзе польскія фальклярысты запісалі яе на тэрыторыі Беларусі яшчэ да 1939 года. У зборніку была змешчана толькі мелодыя песні са словамі. У далейшым была зроблена інструментоўка для ансамбля. Гэты твор з'яўляецца адным з самых любімых у канцэртных праграмах калектыва. Шырока выкарыстоўваюцца матэрыялы музычных зборнікаў «Танцавальная музыка Беларусі» («Карапэт», полька «Шабасоўка», «Лядзецкая полька», вальс «Баламут» і інш.).



*Малюнак 1* - Першы склад ансамбля «Баламуты» (1995 г.)

Ствараючы рэпертуар для ансамбля, неабходна, на наш погляд, імкнуцца да таго, каб кожны новы твор садзейнічаў росту прафесіяналізма музыканта, спрыяў фарміраванню нацыянальнага характару чалавека, служыў крыніцай пераемнасці нацыянальных выканальніцкіх традыцыі і, ў цэлым, адзначаў пераход на новы якасны выканальніцкі і мастацкі ўзровень калектыва. Апрацоўка народнай мелодыі дае магчымасць па-новаму асэнсаваць традыцыйны фальклорны матэрыял, першакрыніцу, улічваць і тэхніка-выканальніцкія і тэмбральныя магчымасці інструмента і яго спалучэнне- сумяшчальнасць у ансамбле. У выніку аўтэнтычны твор атрымлівае новую форму, увасабленне, у якой спалучаюцца традыцыйныя і сучасныя сродкі выразнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Малюнак 2* - Ансамбль «Баламуты» кафедры народна-інструментальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Творчая дзейнасць «Баламутаў» скіравана на забеспячэнне пераемнасці інструментальных традыцый, прафесіянальнае выхаванне, гарманічнае выхаванне асобы на лепшых узорах народнага мастацтва, фарміраванне нацыянальнай і патрыятычнай самасвядомасці праз далучэнне сучаснай моладзі да багатай культурнай спадчыны сваёй Бацькаўшчыны. Шматгадовая работа ў калектыве дапамагае абагульняць і асэнсоўваць назапашаны пакаленнямі выхаванцаў вопыт работы з народным інструментальным мастацтвам, адзначаць станоўчае, вызначаць недахопы і рухацца далей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ